ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

| | |
|---|---|
| 1 месяц | 30 кап. |
| 3 месяцы | 90 |
| 6 месяцаў | 1 р 80 |
| 1 год | 3 р 50 |

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, экратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

№ 265 (935) | СУБОТА, 23-га лістапада 1929 г

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

II СЭСІЯ ЦВК БССР IX СКЛІКАНЬНЯ

## НОВАЯ ПАЛАСА Ў РАЗЬВІЦЬЦІ БССР

### З дакладу тав. Галадзеда аб кантрольных лічбах на 1929-30 год

На вячэрнім пасяджаньні сэсіі ЦВК БССР 20 лістапада з вялікім дакладам аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1929-30 г. выступіў старшыня Савнаркому тав. **Галадзед**

**Вялікі рух наперад**

Гаспадарчы план на другі год пяцігодкі,—каж тав **Галадзед**,—ствараe новую паласу, новую эпоху ў разьвіцьці БССР. Кантрольныя лічбы на другі год пяцігодкі створаны на аснове вынікаў першага году і даюць разгорнутую праграму гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Удзельная вага соцыялістычнага сэктару ў вёсцы па пасяўной плошчы дасягне ня менш 13 проц. Прамысловая продукцыя ўзрасьце на 65 проц., продукцыйнасьць працы на 30 проц., зьніжэньне сабекожту на 10 проц. Гэтыя лічбы яскрава сьведчаць аб вялікім руху БССР уперад ва ўсіх галінах разьвіцьця гаспадаркі.

Пераходзячы да разьвіцьця прамысловасьці тав. **Галадзед** зазначае, што яе валавая продукцыя ў 1929-30 годзе павялічыцца, у параўнаньні з проэктам пяцігодкі на 31 проц., колькасьць рабочых на 18,1 проц. Па асобных галінах прамысловасьць дасьць яшчэ большы рост. Так мэталяапрацоўчая прамысловасьць павялічыцца на 47,4% ільнаапрацоўчая на 46,1 проц., папяровая—21,8 проц., швэйная—

тыўную гаспадарку. У зьвязку з гэтым, кантрольнымі лічбамі прадугледжваюцца капітальныя ўкладаньні ў разьмеры звыш 32 міл. рублёў супроць 6-ці мільёнаў руб. у 1928-29 годзе. Галоўным чынам капітальныя ўкладаньні ў колгаснае будаўніцтва, на пабудовы машыназабесьпячэньняў, трактарызацыі і забясьпечаньне продукцыйнай жывёлай. Процант валавой продукцыі сельскай гаспадаркі ў другім

Рост прамысловасьці і рэканструкцыя сельскай гаспадаркі патрабуюць пашырэньня кадраў спэцыялістых і паскарэньня падрыхтоўкі іх з пролетарскага асяродзьдзя. У зьвязку з гэтым значна пашыраецца колькасьць вучняў у профшколах, тэхнікумах фабзавучах. Агульная колькасьць вучняў у індустрыяльных тэхнікумах, профшколах і г. д. павялічваецца **з 7 да 18.500** чалавек. Пры дзяржаўным унівэрсытэце адчыніўся хэміка-тэхналёгічны факультэт, пры Беларускай сельскагаспадарчай Акадэміі—аддзяленьне па падрыхтоўцы інжынэраў тарфянікаў. Па лініі сельска-гаспадарчай асьветы будзе адчынена шэраг на-



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы